УДК 94(4)"375/1492"

*Якаў Рыер*

# Усходнее ўрапейскія землі ў цывілізацыйным кантэкце сярэднявечча

*Яків Риєр*

## Східноєвропейські землі у цивілізаційному контексті Середньовіччя

*У період раннього середньовіччя в Європі склалися 3 локальні цивілізації. Західноєвропейська цивілізація склалася у процесі германського розселення і захоплення земель Західної Римської імперії. Основна відмінна риса цієї спільності – кодифікація приватної земельної власності, яка відбулася при конвергенції германської традиції одалів – алодів та римського приватного права. Візантійська цивілізація відрізнялася від античних витоків проникненням східних традицій авторитаризму, що робило власницькі відносини негарантованими, залежними від влади. Східноєвропейська цивілізація початково складалася у слов'янському середовищі. Її основою була провідна роль общинної власності, що слідувало з природних особливостей Центральної та Східної Європи, котрі вимагали колективного господарювання. У ході подальшого розвитку західнослов'янські народи зблизилися із західноєвропейською цивілізацією. У східних слов'ян збереглися відзначена особливість общинних порядків. Таким чином, вихідні цивілізаційні відмінності в Європі склалися завдяки природно-кліматичним особливостям заходу і сходу континенту.*

**Ключові слова:** *цивілізації, середньовіччя, Захід, германці, Візантія, слов'яни, ранньосередньовічні держави.*

*Jakaw Ryer*

## East European Lands in Civilization Context of the Middle Ages

*During the period of the early Middle Ages 3 local civilizations were formed in Europe. West-European Civilization was formed in the process of settling of the Germans and the encroachment of the territories of West-Roman Empire. The main significant feature of this community was the codification of private land property, which took place by convergence of the German tradition of odals – alods as well as the Roman private Low. The Byzantine Civilization differs from its antique origins by the penetration of the eastern traditions of authoritarianism, what made the processional relations non-guaranteed and depended on power. East-European Civilization was formed at first in Slavic space. Its basic was the leading role of common property, what was provoked by the natural peculiarities of Central and Eastern Europe demanding collective work. In the period of further development West-Slavic People approached to the western civilization. East-Slaves saved the noticed peculiarity of community's rules. Thus, the initial civilization differences in Europe were provided by the natural und climatic peculiarities of the East and West of the continent.*

**Keywords:** *Civilizations, Middle Age, West, Germans, Byzantine, Slaves, Early-Medieval States.*

*Яков Рыер*

## Восточноевропейские земли в цивилизационном контексте средневековья

*В течении раннего средневековья в Европе сложились 3 локальные цивилизации. Западноевропейская цивилизация сформировалась в процессе германского расселения и захвата земель Западной Римской империи. Основная отличительная черта этого сообщества – кодификация личной земельной собственности, которая произошла при конвергенции германской традиции одалей – аллодов и римского частного права. Византийская цивилизация отличалась от античных истоков проникновением восточных традиций авторитаризма, что делало собственнические отношения негарантированными, зависимыми от власти. Восточноевропейкая цивилизация изначально слагалась в славянской среде. Ее основой была ведущая роль общинной собственности, что следовало из природных особенностей Центральной и Восточной Европы, которые требовали коллективного хозяйствования. В ходе дальнейшего развития западнославянские народы сблизились с западноевропейской цивилизацией. У восточных славян сохранилась отмеченная особенность общинных порядков. Таким образом, исходные цивилизационные различия в Европе сложились из-за природно-климатических особенностей запада и востока континента.*

*Ключевые слова: цывилизации, средневековье, Запад, германцы, Византия, славяне, раннесредневековые государства.*

На пачатку новага тысячагоддзя нават у "бабульцы Еўропе" – ад Шатландыі і Каталоніі да народаў былых Югаславіі і СССР – застаюцца актуальнымі вышуківанні нацыянальнай ідэнтычнасці. Значная роля ў гэтых пошуках адводзіцца гісторыкам. Найбольш прадукцыйным пры выкарыстанні гістарычнага матэрыялу з'яўляецца параўнаўчы падыход. Але, каб не патануць у дробязях, трэба параўноўваць не факты і, нават, не з'явы а структуры*. Для іх даследавання найбольш прыймальным, лічу, з'яўляецца *цывілізацыйны падыход*. Ён апынуўся вельмі плённым, асабліва ў параўнанні з фармацыйным дагматызмам [Гл., напр. 14]. Аднак, як і любое папулярнае паняцце, яго тлумачэнне настолькі пашырылася, што стала выкарыстоўвацца для абгрунтавання выключнасці гістарычных лёсаў асобных народаў. Гэта выклікала рэзкія пярэчанні прыхільнікаў адзінства гістарычных працэсаў, якія паставілі пад сумневы правамернасць цывілізацыйнага падыходу наогул [20]. Але справа ў тым, што паняцце стала занадта шырокім. У інтэрнэтных пошукавіках на запыт «цывілізацыі» чаго толькі не знойдзеш. Наўрад ці з-за гэтага правамерна адкідаць сам цывілізацыйны падыход да аналізу гістарычных працэсаў і канцэпцыі лакальных цывілізацый.

Але ў крытыкаў канцэпцыі лакальных цывілізацый ёсць і іншыя аргументы. Перш на перш яны указваюць на адсутнасць строгага вызначэння паняцця «цывілізацыя» і крытэрыяў яе выяўлення. Але ў гэтай нявызначанасці і заключаецца эўрыстычная каштоўнасць канцэпта. Як складана, шматгранна, рухома чалавецтва ў сваіх шматмільённых праявах, так аморфна і само вызначэнне цывілізацый. У залежнасці ад канкрэтных гістарычных умоў у розных супольнасцяў могуць выдзяляцца і пераплятацца паміж сабой розныя прыкметы, якія не абавязкова строга суадносяцца адзін з другім. Таму лічу, што *цивилизацыі – гэта чалавечыя супольнасці з пэўным узроўнем розных з'яў матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія фармавалі ўмовы жыцця людзей*. Пры такім падыходзе ў роўнай ступені спалучаюцца антрапалагічныя (біялагічныя) і сацыяльныя з'явы. У кожнай цывілізацыі існуюць і ўзаемадзейнічаюць паміж сабой шматлікія пласты – геаграфічнае асяроддзе, сістэма гаспадаркі, сацыяльная арганізацыя, рэлігія, пануючая ідэалогія, духоўныя каштоўнасці, палітычная сістэма, ментальнасць, пры вывучэнні якіх нельга загадзя ўсталёўваць субардынацыю паміж імі [14, с. 15]. І калі гэта прызнаць, то паняцце «цывілізацыі» працуе [Гл. 14; 15]. Тым больш,

* Неабходна ўлічваць, што, как пазбегнуць выпадковых спалучэнняў, ў кампаратывістыцы параўноўваць трэба структуры, сходныя менавіта тыпалагічна, а не па назвах ці датах [Гл. 16].

што у апошні час даследаванні лакальных цывілізацый набылі палітычную актуальнасць. З сацыялогіі і гісторыі яны паступова перамяшчаюцца ў вобласць прыкладной паліталогіі. І хаця цывілізацыйныя прадстаўлення і тэорыі страцілі свой высокі аўтарытэт для сацыяльна-гістарычнай тэорыі, яны захоўваюць пазнавальны патэнцыял і з'яўляюцца актуальным аб'ектам гістарычнага даследавання [5; 6, с. 32, наступн.].

Таким чынам, на працягу ранняга сярэднявечча ў Еўропе вызначыліся тры лакальныя цывілізацыі: на захадзе, паўднёвым усходзе і на ўсходзе кантынента. *Заходнееўрапейская сярэднявечная цывілізацыя* склалася, як вядома, з дзьвух вытокаў: антычнага і германскага. Антычны сусвет, дакладней, Грэцыя падарыла свету дэмакратычную арганізацію грамадскага ладу, заснаваную на безумоўных асабістых правах свабодных палітаў, у тым ліку на маёмасць – асабістую уласнасць. Гэтыя формы, у сваю чаргу, узніклі пад уплывам прыроднага асяроддзя. Агароднiцтва, садоўніцтва, рыбалоўства і марская справа, гандаль, асабліва ў варунках Грэцыі – вонкавы, знешні патрабавалі ад жыхароў прадпрыймальнасці і самастойнасці, а таксама гарантый на здабытыя рэсурсы. Інакш і не магло скласціся, бо, у адрозненне ад асноўнай масы старажытных людзей, якія залежылі ад зямлі, маракі, рыбакі, купцы, да і рамеснікі валодалі ня столькі нерухомасцю, на якую маглі "накладаць лапу" усялякія ўлады, сколькі дынамічным, рухомым прадуктам, які звонку кантраляваць было амаль немагчыма.

Так склалася з-за спецыфічнага геаграфічнага становішча Грэцыі, камяністы рэльеф і прыдатныя для мараходсітва бухты якой абмяжоўвалі магчымасці земляробства, але стваралі ўмовы для адзначаных вышей, менавіта індывідуальных відаў гаспадарання. Дэфіцыт перш на перш зерня стымуляваў замежны гандаль і ўжо з VIII ст. да н. э. ў рэгіёне з'явіліся грошы і, наогул, рынкавыя адносіны. Што так сама спрыяла ўтварэнню асабістай уласнасці. Гэтыя формы грамадскіх адносінаў былі ўспрыняты і Рымам, які развіваўся ў падобных геаграфічных умовах.

Характэрна, што калі пры Аляксандры Македонскім грэкі падпарадкавалі шырокія абшары Блізкага і Сярэдняга Ўсходу з тыповымі земляробчымі ўгоддзямі, ускладнёнымі ірыгацыяй, яны ўспрымалі і тыповыя ўсходнія манархічныя формы палітычнага ладу. Гэтак адбылася сутыкненне марской і рачных цывілізацыяў*. Дарэчы, і класічная Грэцыя знікла, калі была заваявана земляробчай і манархічнай Македоніяй. Нягледзячы на класічнае выхаванне, цар Аляксандр так і застаўся аўтакратам, верагодна, па мянтальнасці. І упадак Рыму таксама адбыўся з-за ўзмацнення дзяржаўнай улады ў часы прынцыпата і даміната. «Усе, да чаго дакраналася цяжкая рука фіска, памірае павольнай смерцю ад поўнага знясілення» [10, с. 136].

Германцы, якія на працягу першай паловы І тыс. н. э. захапілі Заходнюю Еўропу, былі, у агульным, таксама *марскім народам*, толькі паўночным. Як і ў Грэцыі, ў іх было мала зямлі для сельскай гаспадаркі і карміла іх мора, якое зрабіла іх актыўнымі, смелымі, якія падчас падарожжаў набывалі і больш шырокі кругагляд у параўнанні з прывязанымі да зямлі сялянамі. Да таго ж мелкаконтурнасць германскіх палеткаў (горы ў Скандынавіі, забалочаныя нізіны ў Паўночнай Германіі) нарадзіла адасобленыя зямельныя ўладданні – одалі, якія належылі толькі семьям. Таму пры рассяленні ў рымскіх правінцыях германцы адэкватна ўспрымалі рымскія ўласніцкія правы, што адлюстравалася ў складанні адасобленых *алодаў* – асновы германскага землеўкладання. З алодаў вырaслі і падараванні зямлі за службу – будучыя феоды рыцараў. Так, ў агульным, на захадзе Еўропы ў другой палове І тыс. узнік так званы сеньёрыяльны феадалізм**. Ягоная аснова, якая стала і "візітнай карткай" заходняй цывілізацыі – тая самая прыватная уласнасць, якая праз Грэцыю, Рым, германскі алод і сярэднявечны феод стварыла ўнікальную культуру свабодных гарадоў, з якіх пачаўся ўзлет Захаду, які з другой траціны II тыс. пачаў абаганяць ў сваім развіцці астатні свет тых самых рачных цывілізацыяў.

Другой лакальнай цывілізацыяй сярэднявечнай Еўропы з'яўляецца нашчадак Рыму – *Візантыя*. Гэта – асаблівая сярэднявечная цывілізацыя, у якой антычная спадчына мудрагеліста ўвабрала ў сябе ўсходнія элементы: "Візантыя была мостам у Азію, але рух па гэтым мосце ішоў ў адваротным кірунку… Нават хрысціянству ў ёй было наканавана овосточиться" [1, с. 373]. Візантыя – адзіная еўрапейская дзяржава ранняга сярэднявечча з дэталёва распрацаванымі нормамі класічнага права прыватнай уласнасці. Але Візантыйская імперыя – таксама адзіная краіна еўрапейскага сярэднявечча, у манархічны лад якой праніклі рысы старажытных азіяцкіх дэспатый, дзе падданыя толькі пастолькі і да тых часоў валодалі ўласнасцю, паколькі і пакуль гэта было выгадна дэспату; своеасаблівай ўласнасцю былі яны самі [8, с. 8]. Дзяржава магла без суда адабраць прыватныя зямлі і прымусіць уласнікаў да абмену іх уладанняў. Гэта адрознівае пазямельнага адносіны ў Візантыі ад раннесярэднявечнай Заходняй Еўропы. У адпаведнасці з гэтым у Візантыі ў IV–V ст. склалася патрыстычная канцэпцыя, згодна з якой прыватная ўласнасць на зямлю гэтак жа неймаверная, як на паветра і сонечнае святло, і належаць усе яны Богу. Шляхам падстаноўкі атрымлівалася, што вярхоўным уласнікам зямлі апынуўся імператар, які абагатвараўся і ўвасабляў у сваёй асобе дзяржаву. А ўся ўласнасць станавілася падуладнай казне [7, с. 97–98]. З-за чаго так склалася?

У адрозненне ад захада, ва ўсходніх правінцыях Рымскай імперыі пры існаванні рабства захаваўся і значны слой вольнага працоўнага насельніцтва. З пачаткам крызіса класічнага рымскага рабаўладання менавіта свабодныя працоўныя, асабліва – сяляне – спрыялі захаванню гаспадарчых сувязяў і той фінансавай сістэмы, якая забяспечвала існаванне дзярдаўнага апарату з развітой бюракратыяй. Апошняя не дазволіла скласціся такой эканамічнай і палітычнай самастойнасці розных груп землеўладальнікаў, як на Захадзе. Адсюль адсутнасць "феадальнай лествіцы", што, напрыклад, надзвычай здзівіла заходніх крыжакоў у часе Першага крыжовага паходу, як і наяўнасць гарадоў без абаронччых збудаваняў, што сведчыла аб адсутнаці ў Візантыі гарадскога самакіравання. Становішча ў грамадскай іерархіі тут вызначалася ня валоданнем зямлёй, а пасадай, што рабіла кіруючую эліту ў большай ступені залежнай [Гл., напр., 19]. Дзяржаўная ўлада праз працуючую фіскальную сістэму захоўвала эканамічны кантроль за ўсімі зямельнымі ўладаннямі. Пры гэтым захаванне старой арыстакратыі, магутнай бюракратыі і гараджан зрабіла пануючы пласт Візантыі больш шматлікім, чым на

* *Рачнымі* называюць старажытныя і сярэднявечныя цывілізацыі Ўсходу, якія ўзніклі ў басейнах Нілу, Тыгру і Еўфрату, Інду і Гангу, Янцзы і Хуанхэ. Падрабязна аб гэтай цывілізацыйнай дыхатоміі гл. [9; 22; 23].

** Падрабязнее аб разуменні феадалізма гл. [17].

Захадзе, што павялічыла паборы з працоўнага насельніцтва і абцяжарыла гаспадарчае развіццё.

Усё гэта, нягледзячы на высокі ўзровень духоўнай культуры, які перавышаў заходнееўрапейскі, асабліва ў раннім сярэднявеччы, не стварыла ўмоў для дынамічнага гаспадарчага развіцця Візантыі і спрыяла яе адставанню ад Захаду і збліжэнню з Усходам. Асабліва гэта выявілася пасля XI ст. – з эпохі крыжовых паходаў, калі пачынаецца згасанне спецыфічнай візантыйскай цывілізацыі. У гэты час, аднак, пачалі развівацца некаторыя рысы, якія нагадвалі заходнееўрапейскія, перш за ўсё – узмацненне прыватнаўласніцкіх правоў на зямлю, што спрыяла і росту незалежнасці феадалаў ад цэнтральнай улады. Але працяглая ўзаемная барацьба аслабіла абедзве галіны пануючага саслоўя. У выніку, слабела і краіна ў цэлым: і яе эканоміка, і палітычная сістэма. А гэта аказалася згубным ва ўмовах кансалідацыі суседзяў Візантыі. Калі ў раннім сярэднявеччы краіне яшчэ хапала рэсурсаў для абароны, перш за ўсё, ад качэўнікаў з Усходу і Поўдня, то ў XI ст. яна атрымоўвае жорсткую паразу ад турак-сельджукаў, у XIII ст. яе разграмілі крыжакі, а XIV–XV ст. наогул праходзяць пад знакам агоніі ў няроўнай барацьбе з туркамі-асманамі.

Гарады, багатыя і развітыя, мала чым нагадвалі заходнееўрапейскія. Хутчэй яны былі ледзь не копіяй ўсходніх, дзе дзяржаўная рэгламентацыя скоўвала ініцыятыву гандлёва-рамесных карпарацый. З канца XII стагоддзя адзначаецца эканамічная перавага заходнееўрапейскіх гарадоў, у якіх развівалася некантраляваная феадальнымі ўладамі рынкавая гаспадарка. Менавіта з гэтага часу шляхі Заходняй Еўропы і Візантыі разыходзяцца канчаткова. І гаворка не толькі войнах з крыжакамі або з Венецыяй, у якіх час ад часу Візантыя цярпела паразу. Значна істотна тое, у сілу падабенства візантыйскіх гарадоў усходнім, у іх не перамаглі рынкава-прыватнаўласніцкія адносіны [18, с. 77–78].

У развітым сярэднявеччы Візантыя захавала свае ранейшыя дваістыя рысы, звернутыя і да Захаду, і да Усходу (як у гербе Палеалогаў – двухгаловым арле). Відавочна, ўсходнія элементы ў ёй усё ж пераважылі. Адсюль традыцыйная адасобленасць ад Захаду праваслаўнай культуры, яе арыенталізацыя [2, с. 38; 18, с. 76–78]. Для гэтага былі і аб'ектыўныя ўмовы. У раннім сярэднявеччы культура краіны, як вядома, пераўзыходзіла заходнюю. Чацвёрты крыжовы паход і часовае панаванне лацінян ў XIII ст. ўзмацнілі ўсенароднае супрацьстаянне заходняй, каталіцкай культуры. Але і Усход быў чужым. Так Візантыя апынулася ў тупіку і пакінула гістарычную арэну.

На ўсход ад Эльбы значная частка кантыненту з пачатку сярэднявечча ўваходзіла ў *арэал славянскага рассялення*. Характэрнай рысай старажытнага славянства былі моцныя абшчыны, якія перашкаджалі з'яўленню алода [13, с. 204].

Прычыны трываласці супольных сувязяў ляжалі, перш за ўсё, у асаблівасцях прыроднага асяроддзя: значная, у параўнанні з захадам кантынента, лясістасць, больш кантынентальны клімат з меншай працягласцю цёплых дзён у годзе. Адсюль – пры агульнай меншай шчыльнасці насельніцтва – патрэба ў калектыўнай, сумеснай працы, асабліва пры падсечна-агнявым земляробстве. Пры гэтым рэльеф, у адрозненне ад скандынаўскага, не размяжоўваў ўгоддзі асобных сялянскіх калектываў, дазваляў вялікім сем'ям захоўваць агульнае землекарыстанне і сумесную працу на такіх уладаннях. Абследаваныя археолагамі заходнеславянскія паселішчы аж да канца І тыс. дэманструюць наяўнасць агульнай гаспадаркі вялікіх сем'яў, а пачатак адасаблення індывідуальных сялянскіх двароў там адзначаецца толькі з X–XI ст. [12, с. 115; 13, с. 190–191].

Моцная абшчына абмяжоўвала правы на зямлю знаці, якая ўзнікала з VIII ст. У грамадстве не склалася ўяўленне аб магчымасці адчужэння зямлі асобнай сям'ёй. Арыстакратыя распараджалася зямлёй як адміністрацыйная і палітычная ўлада. Але не магла, у адрозненне ад заходніх сеньёраў, мець зямлю ў асабістым валоданні і раздаваць яе на такіх жа ўмовах сваім набліжаным. Таму ў ранніх славянскіх дзяржавах, якія сталі ўзнікаць у IX–X ст., Вялікамараўскае Майміравічы, Пржэмыславічы, Пясты, Рурыкавічы, у адрозненне ад элітаў Заходняй Еўропы, аказваліся не толькі самымі буйнымі землеўладальнікамі ў сваіх краінах, але і адзінымі. Яны мелі права распараджацца ўсёй зямлёй і людзьмі, якія жылі на ёй, але не як прыватныя асобы, а як кіраўнікі. Буйное землеўладанне ўзнікала па прынцыпе кармленняў, гэта значыць, не замацоўвалася ў спадчыне. Доўга не фармавалася дробнае землеўладанне служылага пласта – рыцараў, затрымлівалася іх асяданне на зямлю. Пануючы слой складаўся ў асобнае саслоўе павольна. Пачаўшыся ў VIII–IX ст., гэты працэс завяршыўся толькі ў XI–XIII ст., прычым пад заходнім уплывам, які адбываўся праз палітычныя і асабістыя кантакты (Чэхія, ўспомнім, наогул з X ст. была васалам Свяшчэннай Рымскай імперыі), праз каталіцтва, праз нямецкую каланізацыю і экспансію.

Але пераход на заходнюю мадэль феадалізму праз прыкладна 200–300 гадоў адбіўся на ўсім далейшым развіцці рэгіёну*.

Такое павольнае сацыяльнае развіццё ў вёсцы прытармазіла і развіццё гарадоў. Доўга застаючыся асабіста вольным, сельская рамеснае насельніцтва не імкнулася адрывацца ад зямлі. Насельніцтва гарадоў расло павольна. Больш інтэнсіўна гарады сталі развівацца з XIII–XIV ст., калі ў іх разам з каланістамі, было прынесена нямецкае гарадское права [3; 21; 24, s. 105]. Развіццё гарадской эканомікі, аднак, адмоўна паўплывала на становішча сялян. Як і на Захадзе, феадалы апынуліся зацікаўленымі ў павелічэнні даходаў. Аднак заходні варыянт з камутацыяй павіннасцяў быў тут немагчымым з-за таго, што большасць сялян яшчэ заставалася асабіста вольнай. Адвольна павышаць рэнту было і цяжка, і небяспечна, бо парушала традыцыі. Зацікаўленыя ў працоўных руках, феадалы дамагаліся ад улады прымацавання сялян да зямлі, што і прывяло да з'яўлення прыгоннага права ў XV–XVI ст. Такім чынам, развіццё гарадоў у Цэнтральнай Еўропе ў з-за павольнага фарміравання феадальных парадкаў у вёсцы прывяло не да аслаблення, як на Захадзе, сялянскай залежнасці, а да ўмацавання яе ў той форме (прыгон), якая ў заходнееўрапейскіх краінах была ўжо выкаранена.

У выніку феадальнае грамадства ў рэгёне ўмацавалася, што пры пераходзе да новага часу адмоўна адбілася і на развіцці гарадоў. Агульныя сацыяльныя працэсы рэгіёну замарудзіліся, і ён надоўга ператварыўся ў аграрны прыдатак Заходняй Еўропы. У палітычным жа развіцці рэгіёну адбывалася яго паступовае збліжэнне з Заходняй Еўропай: фармавалася каралеўская ўлада і саслоўна-прадстаўнічыя манархіі, сістэма васалітэту. Збліжала цэнтральнаеўрапейскае насельніцтва з заходнім і агульная каталіцкая ідэалогія, а лацінская культура, якая выйшла з яе.

---

* Падрабязнее гл. [13, с.181–182, 187–188; 16]. Там жа і адпаведныя спасылкі.

Асноўнае насельніцтва Ўсходняй Еўропы ў разглядаемыя часы таксама, як і ў цэнтры кантынента, было славянскім. І той грамадскі лад, які складаўся на прыканцы І тыс. н. э. у ранніх усходнеславянскіх дзяржаўных ўтварэннях – княствах *старажытнарускай супольнасці* – быў блізкім заходнеславянскім ранніміі княствам. Бо таксама вырастаў, у канчатковым выніку, на падставе трывалай сялянскай грамады (абшчыны). Якая ўмацоўвалася і больш кантынентальным кліматам, і яшчэ меньшай шчыльнасцю насельніцтва. Пры гэтым з-за аддаленасці сюды амаль не даходзілі тыя заходнія імпульсы, якія адчуваліся ў заходніх славян, асабліва ў іх пануючых верхах. У старажытнарускіх княствах склалася карпаратыўнае валоданне зямлей. Сяляне амаль да XVI–XVII ст. заставаліся вольнымі. Гарады ад пачатку складаліся не як цэнтры рынкавых адносін рамеснікаў і гандляроў, а як княска – дружынныя рэзідэнцыі. Гэтаму спрыяла і роля варагаў ў стварэнні дзяржаўнасці.

Аддаленасць ад Захаду і суседства са стэпам яшчэ больш умацоўвала адзначаныя рысы грамадскага існавання. Менавіта невыпадкова і прыняццё хрысціянства ад Візантыі з яе вышэй адзначанымі ўсходнімі аўтарытарнымі рысамі і вядомым падпарадкаваннем царквы свецкай палітычнай уладзе. Паварот да ўсходу ў часы Аляксандра Неўскага канчаткова замацаваў разгледжаныя асаблівасці *усходнееўрапейскай сярэднявечнай цывілізацыі*. Тут трэба яшчэ раз падкрэсліць, што нягледзячы на прамыслова-гандлёвы і культурны росквіт старажытнарускіх гарадоў яны заставаліся пад кантролем і кіраваннем князка-дружыннай супольнасці, што зрабіла ў далейшым немагчымым для іх зрабіцца асновай для развіцця рынкавых, капіталістычных адносін.

На заканчэнне варта заўважыць, што з XIII ст. разгледжаная усходнееўрапейска супольнасць ужо не была адзінай. Галіцкае княства на захадзе збліжалася з цэнтральнаеўрапейскім светам. У землі Дняпроўскага (умоўна) басейна з XIV ст. з умацаваннем Вялікага княства Літоўскага таксама паступова пранікалі заходнія імпульсы, асабліва, з XV ст. праз магдэбургскае гарадское права, а ў XVI ст. – ў пазямельныя адносіны праз Уставу на Валокі, якая прынесла ў вёску нямецкае права. Але большасць сялянства, па меншай меры на беларускіх землях, засталася вернай традыцыям старой абшчыннай супольнасці з яе звычаямі [Гл., напрыклад, 4]. У гэтым можна бачыць захаванне спецыфічнай ўсходнееўрапейскай цывілізацыйнай ментальнасці.

**1**. *Бродский И.* Форма времени / И. Бродский. – Мн., 1992. – Т. 2. **2**. *Васильев Л. С.* Возникновение и эволюция частной собственности на Востоке / Л. С. Васильев // Частная собственность на Востоке. – М., 1998. **3**. *Галямичев А. Н.* Город и городское право в средневековой Чехии / А. Н. Галямичев // Право в средне-вековом мире. – М., 1996. **4**. *Голубеў В. Ф.* Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII ст. / В. Ф. Голубеў Мн. 2008. **5**. *Ионов И. Н.* Современные подходы к изучению цивилизаций / И. Н. Ионов // Сравнительное изучение цивилизаций мира (междисциплинарный подход). – М., 2000. **6**. *Ионов И. К.* Цивилизационное сознание и историческое знание: проблемы взаимодействия / И. Н. Ионов. – М. 2007. **7**. *Каждан А. П.* Византийская культура (X–XII вв.) / А. П. Каждан. – Изд. 2. – СПб., 1997. **8**. *Литаврин Г. Г.* Этносоциальная структура славянского общества в эпоху поселения на Балканах (VI–VII вв.) / Г. Г. Литаврин // Византия и славяне. СПб., 1999. **9**. *Мечников Л. И.* Цивилизации и великие исторические реки / Л. И. Мечников. – М., 1995 (2006). **10**. *Петрушевский Д. М.* Очерки из экономической истории средневековой Европы / Д. М. Петрушевский. – М.; Л., 1928. **11**. *Риер Я. Г.* Становление феодальных отношений у западных славян в свете археологических данных / Я. Г. Риер // Вопросы истории. – 1988. – № 10. **12**. *Риер Я. Г.* К проблеме социального развития раннесредневековой Восточной и Центральной Европы: сравнительный анализ археологических данных / Я. Г. Риер // Российская археология. – 1996. – № 1. **13**. *Риер Я. Г.* Аграрный мир Восточной и Центральной Европы в средние века по археологическим данным / Я. Г. Риер. – Могилев. 2000. **14**. *Риер Я. Г.* Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа / Я. Г. Риер. – Могилев, 2003. **15**. *Риер Я. Г.* Цивилизации средневековой Европы / Я. Г. Риер // Вестник Европы. – 2006. – Т. XIX–XX. **16**. *Риер Я. Г.* О значении и задачах компаративистики в исторических исследованиях / Я. Г. Риер // Романовские чтения – 4. – Могилев, 2008. **17**. *Рыер Я. Р.* Да сучаснага разумення паняцця "феадалізм" / Я. Р. Рыер // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 1. **18**. *Фадеева И. Л.* Формы владения и собственности в Европе и на Ближнем Востоке в древности и средневековье / И. Л. Фадеева // Частная собственность на Востоке. – М. 1998. **19**. *Чекалова А. А., Поляновская М. А.* Интеллектуалы и власть в Византии / А. А. Чекалова, М. А. Поляновская // Византийские очерки. – М., 1996. – С. 5–24. **20**. Шнирельман В. А. Слово о «голом (или не вполне голом) короле» / В. А. Шнирельман // Историческая психология и социология истории. – М., 2009. – Т. 2. – № 2. **21**. *Keller O.* Einführung und Adaptation des deutschen Rechts im östlichen Europa während Mittelalter und Früher Neuzeit unter besonderer Berücksichtigung neuerer Forschungen / O. Keller // Zeitschrift für Neuere Rechtsgeschichte. – 2012. – Jg. 34, № 3/4. **22**. *Pirenne J.* Les grands courants de l'histoire universelle / J. Pirenne. De. 1–7, Neuchâtel / Paris 1945–56. **23**. *Wittfogel K. A.* Oriental Despotism / K. A. Wittfogel. – Massachusetts: Yale university Press., 1957. **24**. *Wyrosumski J.* Czy późnośredniowieczny krysys feudalizmu dotknął Polskę? / J. Wyrosumski // Homines et societas. Czasy Piastów i Jagellonów. – Poznań, 1997. – S. 103–113.

УДК [323.1:008]: 351.86

*Юлія Руденко*

## Національна ідентичність як складова цивілізаційної ідентичності в контексті забезпечення національної безпеки України

*Стаття присвячена проблемі формування національної ідентичності крізь призму залучення до світового цивілізаційного процесу у контексті забезпечення національної безпеки України. Розглянуті чинники формування національної ідентичності.*

**Ключові слова:** *національна ідентичність, національна безпека, цивілізаційний процес.*

*Yuliia Rudenko*

## National Identity as a Component of Civilization Identity in the Context of Ensuring of Ukraine's National Safety

*The article is devoted to the formation of national identity through the prism of the involvement of world civilization process in the context of ensuring national security of Ukraine. The factors of formation of the national identity are investigated.*

**Keywords:** *Nation Identity, National safety, Civilization Process.*